**Маўленчая размінка.** Выразна прачытайце скорагаворку з інтанацыяй паведамлення, пытання і радаснага здзіўлення. Вымаўляйце правільна гукі [дз’], [ч], [ц’], [р].

## СКОРАГАВОРКА

**Р**аніцою золкай
**Цецяр**ук з **цяце́р**кай
Пры**в**ялі ў **дзіцяч**ы сад
**Ч**аты**р**ох **цецер**анят.
*Міхась Пазнякоў.*



***Па́л*** — агонь.
***Заўзя́та*** — тут: рабіць нешта напорыста, упарта.



## УЛАДЗІМІР МЯЖЭВІЧ

## Цяцерка

Мы рабілі ўсё, што маглі, але агонь не сціхаў. Моцны вецер падхопліваў кавалкі сухой драўніны, перакідваў іх у лес. Макае́д на сваім вяку гасіў не адзін пажар. Бачыў усякае, але такой вялікай бяды не здаралася.



Правообладатель Национальный институт образования

— Застаецца адно — пусціць сустрэчны пал, — сказаў Макаед. — Толькі так можна спыніць агонь.

Блізка ад мяне працаваў дванаццацігадовы Рыгорка, сын лесніка. Мы з ім рыхтавалі сухое ламачча, каб пусціць сустрэчны агонь.

— Дзядзька! — пачуў я раптам голас Рыгоркі. — Хутчэй сюды!

— А што такое?

— Тут птушка!

---

Пафантазіруйце, што адбудзецца далей. Як павядуць сябе героі?

---

Падобная на хатнюю курыцу, шэрая цяцерка заўзята аддзірала кіпцюрамі верхні пласт сухога перагною. Цяцерка ратавала ад агню сваіх дзяцей! Яна паглыбляла равок, каб не пусціць агонь да гнязда.

— Трэба ёй дапамагчы! — сказаў Рыгорка.

— Можа, перанесці гняздо ў бяспечнае месца? — прапанаваў я.

— А ці паляціць за ім цяцерка?

— Разважаць няма калі.

Цяцерка пачала мітусліва кружыць. Яна ледзь не біла нас крыламі, пагрозліва шыпела. Птушаняты пішчалі. Я сам хацеў узяць гняздо, але не змог. Цяцерка зрабіла яго з сухой травы, што



Правообладатель Национальный институт образования



расла пад бярозкай, і яно было нібы прышыта да зямлі.

— Рыгорка, хутчэй рыдлёўку!

Мы зрэзалі тонкі пласт зямлі разам з гняздом. Недалёка была паляна, а за ёй — лес, якому пажар не пагражаў. Мы з Рыгоркам кінуліся туды. Я на рыдлёўцы нёс гняздо, а Рыгорка падтрымліваў яго, каб не ссунулася.

— Загінуць птушкі без мамкі, — пашкадаваў Рыгорка, калі мы ўладкавалі іх на новым месцы.

— Пачакай, можа, яшчэ прыляціць.

І сапраўды, праз некалькі хвілін мы ўбачылі нашу цяцерку.

Як мы ўзрадаваліся! А яна падляцела да нас і дзеўбанула Рыгорку ў патыліцу. Але хлопчык не пакрыўдзіўся. Зразумеў, што гэта ад трывогі і страху за дзяцей.

*Паводле Уладзіміра Мяжэвіча.*



Правообладатель Национальный институт образования

1. Якое няшчасце здарылася ў лесе?
2. Хто тушыў агонь? Як удалося прыпыніць яго?
3. Як паводзіла сябе птушка ў час пажару? Прачытайце адпаведныя радкі.
4. Чаму яна біла ратавальнікаў крыламі, шыпела, а пазней нават дзеўбанула Рыгорку ў патыліцу?
5. Якую дапамогу аказалі цяцерцы з цецеранятамі героі апавядання? Ацаніце іх учынак.
6. Што абазначае выраз «І яно [гняздо] было нібы прышыта да зямлі»?
7. Чаму ратавальнікі не бралі птушанят у рукі, а зразалі гняздо рыдлёўкай?
8. На якую тэму напісаны гэты твор?

Перакажыце змест твора па пытаннях.

1. Якая бяда здарылася ў лесе?
2. Што прапанаваў ляснік Макаед, каб спыніць агонь?
3. Каго ўбачыў Рыгорка на зямлі?
4. Якім чынам цяцерка ратавала сваіх дзяцей?
5. Што зрабілі героі апавядання, каб дапамагчы птушкам у бядзе?
6. Як паводзіла сябе цяцерка-маці ў час дапамогі?
7. Што хвалявала Рыгорку, калі яны пераносілі птушынае гняздо?
8. Чаму ўзрадаваліся героі апавядання?


Правообладатель Национальный институт образования

**Давайце абмяркуем.** Чаму апавяданне «Цяцерка» ўключана ў раздзел «Чалавек без Радзімы, што салавей без песні»? Абгрунтуйце сваю думку.

**Маўленчая размінка.** Прачытайце загадкі. Пра якія палявыя расліны гаворыцца ў іх? Пры чытанні звяртайце ўвагу на правільнае вымаўленне гукаў [ў], [дз’], [г], [ч], [ц’].

## ЗАГАДКІ

Жоўтае мора ля вёскі
Ціха шапоча, шуміць.
Сіняе вочка валошкі
Светла навокал глядзіць.





За дарогаю на полі
Прыгажун сцяной стаіць.
Стройны, сонечны, вясёлы,
Завушніцамі звініць.

*Міхась Пазнякоў.*

***Прыва́бны*** — прыемны, чароўны.
***Спо́рыцца дбайна*** — тут: праца ідзе паспяхова.



Правообладатель Национальный институт образования